**“Віртуальная рэканструкцыя кніжных збораў І.Х. Каладзеева: да 200-годдзя вайны 1812 г.” (2011–2012 гг.)**

Бібліятэка барысаўскага памешчыка, калекцыянера і бібліяфіла Івана Хрысанфавіча Каладзеева (1859–1914) уяўляла сабой самы багаты ў Еўропе збор кніг, рукапісаў, карт, выяўленчых матэрыялаў па гісторыі вайны 1812 г. і напалеонаўскіх войнаў. У 1910-я гг. гэты збор аказаўся падзелены паміж некалькімі ўстановамі. У 1926 г. каля 8 тыс. кніг паступіла ў Дзяржаўную бібліятэку БССР. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі вядзецца выяўленне (бібліятэка Каладзеева не мела экслібрыса) і бібліяграфічнае апісанне гэтых кніг. Да 200-годзя вайны 1812 г. распрацаваны навуковы праект, які прадугледжвае бібліяграфічную рэканструкцыю кнігазбору І.Х. Каладзеева, прысвечанага гісторыі Айчыннай вайны 1812 г., і ўвядзенне яго ў шырокі навуковы і культурны абарот. У выніку навукова-даследчай работы ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі было выяўлена звыш 3 500 дакументаў (каля 200 найбольш рэдкіх асобнікаў з аўтографамі захоўваюцца ў навукова-даследчым аддзеле кнігазнаўства), складзена картатэка на выданні са збору І.Х. Каладзеева, у электронным каталозе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі фарміруецца калекцыя бібліяграфічных запісаў “Бібліятэка І. Каладзеева ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі” і электронная бібліятэка лічбавых копій выданняў. Распрацоўваецца магчымасць стварэння электроннага мультымедыйнага выдання, якое прадставіць звесткі пра месцазнаходжанне і стан дакументаў з калекцыі І.Х. Каладзеева, што ў сённяшні час рассеяны па розных установах Беларусі і Расіі.